Газета Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта
www.gazeta.bsu.by

# УНІВЕРСІТЭТ

Пераможца V Нацыянальнага конкурсу друкаваных СМІ «Залатая літара» ў намінацыі «Найлепшая шматтыражная газета»

15 лістапада 2013 года, № 17 (2099)

АКТУАЛЬНА




Фота Яўгена ПАМЫТКІНА

*Удзельнікі канферэнцыі ААН па космасе абмеркавалі сацыяльна-эканамічныя перавагі ад выкарыстання касмічных тэхналогій*

# БЕЛАРУСЬ УМАЦОЎВАЕ СТАТУС КАСМІЧНАЙ ДЗЯРЖАВЫ

Упершыню ў Беларусі прайшла канферэнцыя ААН па космасе. Навуковы форум **«Выкарыстанне касмічных тэхналогій для сацыяльна-эканамічнага развіцця краін»** працаваў з 11 па 15 лістапада ў Беларускім дзяржаўным універсітэце.

Яго арганізатарам выступіла Упраўленне Арганізацыі Аб'яднаных Нацый па пытаннях касмічнай прасторы (UN-OOSA) пры падтрымцы фонду «За бяспечны свет» (SWF). Старшынёй праграмнага камітэта быў рэктар БДУ акадэмік Сяргей Абламейка.

Урачыста адкрывалі канферэнцыю першы намеснік міністра адукацыі нашай краіны Аляксандр Жук, галоўны вучоны сакратар Прэзідыума НАН Беларусі Сяргей Кілін, прадстаўнікі Упраўлення ААН па пытаннях касмічнай прасторы і фонду «За бяспечны свет» Сяргей Чэрнікаў і Агнешка Лукашчук адпаведна, а таксама начальнік Упраўлення стратэгічнага планавання і мэтавых праграм Раскосмасу Юрый Макараў.

Прадстаўнік UN-OOSA *Сяргей Чэрнікаў* паведаміў, што Беларусь стане членам Камітэта ААН па выкарыстанні касмічнай прасторы ў мірных мэтах з 2014 г. У снежні павінна быць падпісана адпаведная рэзалюцыя Генасамблеі ААН. Ён падкрэсліў, што «ў нас была вялікая цікавасць правесці канферэнцыю менавіта тут, таму што Беларусь і прылеглыя да яе краіны вельмі актыўна ўдзельнічаюць у касмічнай дзейнасці. Распрацоўкі беларускіх спецыялістаў выкарыстоўваюцца на Міжнароднай касмічнай станцыі, навукоўцы актыўна працуюць над стварэннем малых спадарожнікаў».

Як адзначыў галоўны навуковы сакратар НАН Беларусі *Сяргей Кілін*, членства Беларусі ў Камітэце ААН па выкарыстанні касмічнай прасторы ў мірных мэтах дасць рэспубліцы шырокія магчымасці зносін з тымі краінамі, якія ўжо ўваходзяць у клуб. Гэта галоўным чынам інфармацыя, магчымасць рэалізацыі сумесных праектаў з іншымі краінамі і выхад на іх рынак, падрыхтоўка маладых спецыялістаў па міжнародных праграмах.

Першы намеснік міністра адукацыі Беларусі *Аляксандр Жук* у сваю чаргу адзначыў, што касмічныя тэхналогіі пранікаюць ва ўсе сферы нашага жыцця, і таму, натуральна, узнікаюць задачы, якім чынам выкарыстоўваць іх для паляпшэння дабрабыту нашых краін і развіцця эканомік. «Што да вострых пытанняў, якія сёння будуць абмяркоўвацца, то гэта фінансаванне, бо касмічныя тэхналогіі – справа досыць дарагая», – сказаў ён.

Правядзенне навуковага форуму такога высокага класа ў Беларусі невыпадковае. Наша краіна паслядоўна займаецца асваеннем касмічнай прасторы. У 2012 г. на арбіту быў выведзены айчынны касмічны апарат. І зараз Беларусь атрымлівае і апрацоўвае інфармацыю з космасу, не прыцягваючы спецыялістаў іншых краін. Дарэчы, на пленарным пасяджэнні генеральны дырэктар Аб'яднанага інстытута праблем інфарматыкі НАН Беларусі прафесар Аляксандр Тузікаў распавёў пра стварэнне беларускай касмічнай сістэмы дыстанцыйнага зандзіравання Зямлі і канцэпцыю новай Нацыянальнай касмічнай праграмы да 2017 года.

Падчас працы 8 секцый з дакладамі выступілі каля 80 навукоўцаў і спецыялістаў у галіне касмічных навук з Беларусі, Расіі, Украіны, Азербайджана, Германіі, Іспаніі, Ірана, Ізраіля, Індыі, Лівіі, Турцыі, Кітая, Чылі, Егіпта, Малайзіі і інш. Усяго было прадстаўлена 25 краін.

Удзельнікі форуму абмеркавалі сацыяльна-эканамічныя перавагі, атрыманыя ад выкарыстання касмічных тэхналогій, абмяняліся інфармацыяй па даследчых і прыкладных працах. Таксама разгледзелі прынцыпы і механізмы кааперацыі ў распрацоўцы касмічных тэхналогій, прадэманстравалі прыклады выкарыстання гэтых тэхналогій для развіцця галін народнай гаспадаркі сваіх краін. У прыватнасці, прэзентацыі, даклады і дыскусіі былі прысвечаныя развіццю касмічных сістэм і абсталяванню, выкарыстанню тэхнікі для папярэджання і ліквідацыі надзвычайных сітуацый, маніторынгу Зямлі, навакольнага асяроддзя і інш. Акрамя таго, была праведзеная нарада па пытаннях пашырэння ўдзелу нашай краіны ў касмічных праграмах ААН.

Можна адзначыць шырокі ўдзел спецыялістаў БДУ ў абмеркаванні ўсіх тэм. На адным з семінараў, прысвечаным міжнароднай і рэгіянальнай інтэграцыі, удзельнікаў азнаёмілі з праектам стварэння беларуска-расійскага ўніверсітэцкага даследчага нанаспадарожніка (БДУ сумесна з Паўднёва-заходнім дзяржаўным універсітэтам (Курск, РФ)). Акрамя таго, ішла гаворка пра: ролю і месца касмічных тэхналогій у агульных геаманіторынгавых сістэмах (праф. М. Жураўкоў, праф. В. Краснапрошын, доктар геагр. навук В. Губін, А. Канавалаў); стварэнне касмічных сістэм вымярэння, апрацоўку і метады абароны інфармацыі для маніторынгу прыродных і антрапагенных аб'ектаў (праф. Б. Бяляеў, дактары фіз.-мат. навук П. Кучынскі, Л. Каткоўскі, канд. фіз.-мат. навук В. Сосенка з НДІ ПФП імя А. Сеўчанкі БДУ); аэракасмічную адукацыю ў Рэспубліцы Беларусь (акадэмік С. Абламейка, канд. фіз.-мат. навук В. Панарадаў, праф. У. Саечнікаў, сумесна з Міністэрствам адукацыі Беларусі) і інш.

Упраўленне ААН па пытаннях касмічнай прасторы кожны год праводзіць шмат мерапрыемстваў у розных краінах. Гэта чацвёртая ў серыі канферэнцый па падтрымцы выкарыстання касмічных тэхналогій для сацыяльна-эканамічнага развіцця краін. Першая праводзілася ў 2010 г. у Стамбуле (Турцыя), другая ў 2011 г. у Ханоі (В'етнам), трэцяя адбылася ў 2012 г. у Сант'яга (Чылі). Дарэчы, менавіта на апошнім форуме акадэмік Сяргей Абламейка, які мае ў свеце значны навуковы аўтарытэт, выступіў з ініцыятывай правядзення наступнай канферэнцыі ў нашай краіне на базе БДУ, якая і была падтрыманая.

**Сяргей ШАФАЛОВІЧ**

## Чытайце ў нумары:

### ПРАФЕСАРЫ ПРА ПРАБЛЕМЫ НАВУКІ І АДУКАЦЫІ

Навукова-метадалагічны семінар «Актуальныя праблемы развіцця навукі, адукацыі, культуры» запрасіў прафесараў, маладых выкладчыкаў і навукоўцаў БДУ на сваё першае пасяджэнне

Стар. 2

### БЕЛАРУСКАЯ ДЫПЛАМАТЫЯ. ПЕРШЫ МІНІСТР

Факультэт міжнародных адносін правёў цыкл мерапрыемстваў, прымеркаваных да 110-годдзя міністра замежных спраў БССР Кузьмы Кісялёва

Стар. 3

## Весткі з рэктарата

ПАГАДНЕННЕ аб супрацоўніцтве падпісана 5 лістапада паміж БДУ і Туркменскім дзяржаўным універсітэтам імя Махтумкулі. Прадугледжваецца абмен навукоўцамі, выкладчыкамі і студэнтамі, навуковай інфармацыяй і матэрыяламі, ажыццяўленне сумесных даследаванняў і адукацыйных праектаў.

* * *

У СКЛАД VI беларускай антарктычнай экспедыцыі ўвайшоў інжынер-геафізік ННДЦ маніторынгу азонасферы БДУ Ілья Бручкоўскі. На Паўднёвы полюс адправіліся таксама в. а. начальніка Рэспубліканскага цэнтра палярных даследаванняў Аляксей Гайдашоў і інжынер-эколаг НВЦ НАН Беларусі па біярэсурсах Юрый Гігіняк. Палярнікі размесцяцца на расійскай станцыі «Прагрэс» на ўзбярэжжы заліва Прудс. Яны даследуюць наваколле і правядуць эксперыменты для ацэнкі магчымасці будаўніцтва першай беларускай антарктычнай станцыі. Беларусы прыбудуць на ледзяны кантынент 14 снежня, а ў Мінск вернуцца 14 красавіка 2014 г.

* * *

РЭСПУБЛІКАНСКАМУ інстытуту вышэйшай школы БДУ споўнілася 40 гадоў! Гэтай юбілейнай даце была прысвечаная XI Міжнародная навукова-метадычная канферэнцыя «Вышэйшая школа: праблемы і перспектывы». У ёй бралі ўдзел навукоўцы, педагагічныя супрацоўнікі, аспіранты, магістранты беларускіх ВНУ, а таксама госці з Расіі і Украіны.

На форуме разглядаліся пытанні, датычныя гісторыі і сучасных тэндэнцый вышэйшай адукацыі, яе інавацыйных методык і тэхналогій. Асаблівая ўвага надавалася прававому аспекту ў сістэме вышэйшай адукацыі, міжнароднаму супрацоўніцтву і развіццю акадэмічнай мабільнасці.

**Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ**

З ПЕРШЫХ КРЫНІЦ

# ПРАФЕСАРЫ ПРА ПРАБЛЕМЫ НАВУКІ І АДУКАЦЫІ

Навукова-метадалагічны семінар **«Актуальныя праблемы развіцця навукі, адукацыі, культуры»** запрасіў прафесараў, маладых выкладчыкаў і навукоўцаў БДУ на сваё першае пасяджэнне.



Фота Генадзя КРАСКОЎСКАГА

*На першым семінары прафесары і навукоўцы паразважалі над узаемаадносінамі філасофіі і навукі*

### СЕМІНАР ЯК СВАБОДНАЯ ДЫСКУСІЯ

«Сёння вельмі важна асэнсаваць, на якім этапе развіцця мы знаходзімся і якой павінна быць адукацыя ў найбліжэйшы час. У аўдыторыях шмат размоў вядзецца пра тое, хто такі выкладчык ва ўніверсітэце, ці дастаткова для адукацыйнага працэсу яго асобы і якім чынам выкарыстоўваць ІТ-тэхналогіі на занятках са студэнтамі. Таму мы і палічылі, што вельмі добра будзе, калі ў нашым універсітэце пачне функцыянаваць семінар, на якім будуць разглядацца актуальныя праблемы развіцця сучаснай навукі, адукацыі, культуры», – сказаў у сваім уступным слове старшыня савета навукова-метадалагічнага семінара першы прарэктар БДУ Міхаіл Жураўкоў.

У функцыі савета семінара ўваходзіць распрацоўка тэматыкі яго пасяджэнняў, а таксама далучэнне да працы найбольш аўтарытэтных і вядомых навукоўцаў і грамадскіх дзеячаў як нашага ўніверсітэта, так і іншых навучальных і навуковых устаноў. Намеснікам старшыні савета з'яўляецца загадчык кафедры філасофіі і метадалогіі навукі факультэта філасофіі і сацыяльных навук БДУ Анатоль Зелянкоў, што даволі сімвалічна, бо ў папярэднія гады ў дзейнасці як нашага, так і іншых класічных універсітэтаў існавала сур'ёзная традыцыя філасофска-метадалагічнага асэнсавання найважнейшых праблем у прыродазнаўчых і гуманітарных навуках. Характэрна і тое, што ў склад савета семінара ўвайшлі аўтарытэтныя і вядомыя далёка за межамі нашай краіны навукоўцы і даследчыкі як з сферы прыродазнаўчых, так і гуманітарных навук. Сярод іх прафесары Уладзімір Рыгоравіч Барышэўскі, Пётр Іванавіч Брыгадзін, Васіль Іванавіч Стражаў, Віктар Генадзьевіч Шадурскі, Віктар Васільевіч Самахвал і інш. Функцыі сакратара савета выконвае намеснік дэкана па навуковай рабоце хімічнага факультэта Тацццяна Савіцкая. Савет навукова-метадалагічнага семінара збіраецца працаваць у непасрэдным кантакце з прэзідыумам прафесарскага сходу БДУ, які аб'ядноўвае каля 300 прафесараў і дактароў навук нашага ўніверсітэта.

Паводле задумы арганізатараў семінара, адной з найважнейшых яго задач з'яўляецца распрацоўка прапаноў і рэкамендацый па рэфармаванні і аптымізацыі навуковай і адукацыйнай сфер БДУ ў адпаведнасці з перадавымі і прыярытэтнымі напрамкамі развіцця сучаснай навукі, адукацыі, культуры. Аднак яны не настойваюць, што такога выніку можна дабіцца пасля некалькіх пасяджэнняў семінара, і выступаюць за мэтанакіраваную і сістэмную працу па вывучэнні і абагульненні сучаснага сусветнага вопыту падчас свабоднай акадэмічнай дыскусіі.

Трэба сказаць, што такія формы вольнага абмену думкамі ў рамках творчых нефармальных дыскусій з'яўляюцца традыцыйнымі ў дзейнасці вядучых універсітэтаў свету. У апошнія гады наш універсітэт значна актывізаваў сваю дзейнасць у сферы вывучэння перадавога вопыту і заняў годнае месца ў рэйтынгу найбольш вядомых універсітэтаў свету, таму ініцыятыва па арганізацыі навукова-метадалагічнага семінара многім навукоўцам падаецца запатрабаванай і своечасовай.

### ФІЛАСОФІЯ – АДНА З ПРАЯЎ ЧАЛАВЕЧАГА ДУХУ

31 кастрычніка адбылося першае пасяджэнне семінара, на якім з дакладам «Дыялог філасофіі і навукі: ад класікі да сучаснасці» выступіў прафесар Зелянкоў. Асноўная ідэя даклада, які быў прадстаўлены ў форме разгорнутай прэзентацыі, заключалася ў тым, каб паказаць ролю і адвечнае значэнне філасофіі як публічнай практыкі соцыуму, так і ў дзейнасці акадэмічнай супольнасці навукоўцаў, філосафаў, мысліцеляў. Падкрэсліваючы тую акалічнасць, што філасофія ўзнікае і становіцца жыццёва неабходнай менавіта там, дзе ёсць патрэба ў свабодзе як неад'емнай характарыстыцы асобы, дакладчык паказаў, якія вобразы філасофіі ўзнікаюць і зацвярджаюцца ў масавай свядомасці розных супольнасцяў, які лёс філасофіі і філасофскай адукацыі ў нашым грамадстве на розных этапах яго гістарычнай эвалюцыі.

Прафесарам, якія чулі выступленне Анатоля Зелянкова, спадабалася, што асаблівую ўвагу ён надаў складанасцям дыялогу навукі і філасофіі як у гістарычным кантэксце, так і ў сучасную эпоху. Ім падалося цікавым, што ў дакладзе былі асветлены такія актуальныя пытанні, як філасофія і праблемнае поле сучасных навуковых даследаванняў, навука як эфектыўны рэсурс сацыяльнай мадэрнізацыі, а таксама крытыка навуковай рацыянальнасці і міфалагізацыя сучаснай свядомасці.

Нягледзячы на радыкальную крытыку філасофіі і навуковай рацыянальнасці ў сучаснай посткласічнай культуры, выснова даклада гучала стрымана аптымістычна. Лекцыя Анатоля Ізотавіча завяршылася спасылкай на знакамітае выказванне вядомага філосафа і сацыёлага Макса Вебера: «У эпохі крызісаў грамадства, як правіла, падзяляецца на дзве няроўныя часткі. Большасць, не знаходзячы душэўных сіл і інтэлектуальнай энергіі, упадае ў адчай і аддае перавагу жудаснаму канцу. Але заўсёды знаходзяцца людзі, якія здольныя вынесці жах без канца, дэманструючы класічныя ўзоры інтэлектуальнай мужнасці, вернасць маральнаму і прафесійнаму абавязку. Менавіта іх намаганні і канструктыўная праца адкрывалі грамадству новыя перспектывы і стваралі перадумовы для выхаду з крызісных сітуацый. Сама гісторыя наканавала навуковай супольнасці быць цэнтрам такой пазітыўнай працы».

Напрыканцы прафесар Зелянкоў рэзюмаваў, што «філасофія была, ёсць і застанецца адной з самых вялікіх і загадкавых праяў чалавечага духу». Ён адзначыў: «Нягледзячы на самыя нечаканыя і дзіўныя перыпетыі гісторыі, ёй наканаваны лёс птушкі фенікс – заўсёды адраджацца і знаходзіць сваіх прыхільнікаў нават у часы, калі сон Розуму становіцца перадумовай змяркання цывілізацыі».

Наступным з лекцыяй перад удзельнікамі семінара выступіць прафесар Васіль Стражаў. Тэма яго лекцыі – «Трансфармацыя сістэмы вышэйшай адукацыі ў краінах з пераходнай эканомікай (Беларусь, Кітай, Расія)». Гэтая праблема таксама вельмі актуальная, і хочацца спадзявацца, што яна прыцягне ўвагу не толькі членаў прафесарскага сходу БДУ, але і іншых прадстаўнікоў выкладчыцкага корпуса, аспірантаў і маладых навукоўцаў нашага ўніверсітэта.

Дарэчы, усе відэаматэрыялы з пасяджэнняў семінара будуць размешчаны на сайце ***bsu.by*** ў рубрыцы «Відэагалерэя» і абмяркоўвацца ў рубрыцы «Інтэрнэт-семінар».

**Ганна ЛАГУН**

УШАНАВАННІ

# ЗА НАЙЛЕПШЫЯ НАВУКОВЫЯ ПРАЦЫ

На ўрачыстым пасяджэнні Савета БДУ, прысвечаным 92-годдзю альма-матар, уручаны **прэміі імя У. І. Пічэты і А. Н. Сеўчанкі,** а таксама пасведчанні і нагрудныя знакі «Заслужаны работнік БДУ» 43 супрацоўнікам.



Фота Аляксандра СНАПКА

*Лаўрэаты прэмій БДУ Барыс Уласаў і Вячаслаў Мянькоўскі*

Нагадаем, сёлета конкурсы праводзіліся ў ***намінацыі «Навука»***. Усяго ў камісію па прысуджэнні прэміі імя У. І. Пічэты было пададзена 2 працы ў камітэт «Гісторыя, філасофія, эканоміка»; у камісію па прысуджэнні прэміі імя А. Н. Сеўчанкі было пададзена 3 працы, з іх 1 праца ў камітэт «Біялогія і геаграфія» і 2 працы ў камітэт «Фізіка».

*Лаўрэатам прэміі імя У. І. Пічэты* стаў прафесар гістарычнага факультэта **Вячаслаў МЯНЬКОЎСКІ** за «Распрацоўку методыкі сістэмнага вывучэння нацыянальных і рэгіянальных гістарыяграфій».

Званне *лаўрэата прэміі імя А. Н. Сеўчанкі* атрымаў прафесар геаграфічнага факультэта **Барыс УЛАСАЎ**. Яго праца «Экалагічная дынаміка азёрных экасістэм Беларусі» большасцю галасоў членаў камісіі прызнаная найлепшай.

На конкурс па прысуджэнні *прэміі імя У. І. Пічэты сярод маладых навукоўцаў* было пададзена 4 працы, з іх: 2 працы ў камітэт «Філалогія і журналістыка» і па адной працы ў камітэты «Гісторыя, філасофія, эканоміка» і «Правазнаўства і міжнародныя адносіны». Пераможцам прызнаны дацэнт юрыдычнага факультэта **Вадзім Самарын** за цыкл навуковых прац па актуальных пытаннях крымінальнага працэсу.

На конкурс *прэміі імя А. Н. Сеўчанкі сярод маладых навукоўцаў* было пададзена 3 працы: 2 у камітэт «Фізіка», 1 праца ў камітэт «Біялогія і геаграфія». Саветам БДУ ад 30 кастрычніка было прынята рашэнне аб прысуджэнні прэміі двум навуковым працам маладых навукоўцаў: вядучаму навуковаму супрацоўніку Навукова-даследчага інстытута ядзерных праблем БДУ **Міхаілу Шубу** за цыкл прац «Электрамагнітныя ўласцівасці вугляродных нанатрубак і асяроддзяў на іх аснове» і загадчыцы НДЛ біялагічнага факультэта **Ірыне Фякліставай** за «Стварэнне на аснове штамаў-прадуцэнтаў біялагічна актыўных злучэнняў біяпрэпаратаў для абароны раслін».

Акрамя таго, на пасяджэнні Савета БДУ былі абвешчаныя вынікі конкурсу на найлепшыя навуковыя працы студэнтаў БДУ. У галіне сацыяльных і гуманітарных навук найлепшай стала студэнтка магістратуры Інстытута тэалогіі імя святых Мяфодзія і Кірылы *Марына Казмірук*. Яна прадставіла працу «Феномен канверсіі беларускай каталіцкай моладзі ў пяцідзясятніцтва». У галіне прыродазнаўчых і тэхнічных навук пераможцам стаў магістрант фізічнага факультэта *Аляксей Сытаў* за працу «Крышталічная калімацыя і вывядзенне пучка з паскаральніка пры дапамозе выгнутага крышталя».

**Паводле інфармацыі Галоўнага ўпраўлення навукі**

НАША СПАДЧЫНА

# Беларуская дыпламатыя. Першы міністр

Факультэт міжнародных адносін БДУ правёў цыкл мерапрыемстваў, прымеркаваных да **110-годдзя з дня нараджэння міністра замежных спраў БССР Кузьмы КІСЯЛЁВА.**




Рэспубліканскія СМІ таксама не засталіся ўбаку: тэлебачанне зняло інфармацыйныя сюжэты пра фотавыставу, якая разгарнула сваю экспазіцыю на 11 паверсе ФМА, пра сустрэчы студэнтаў ФМА з сынам дыпламата Васілём Кісялёвым. Дарэчы, Васіля Кузьміча можна назваць «нашым» чалавекам, ён добра адчуваў моладзевую аўдыторыю і заўсёды быў дасведчаны наконт прадмета гутаркі. Ён кандыдат гістарычных навук, доўгі час выкладаў на гістфаку БДУ. Таму сустрэча прайшла, як кажуць дыпламаты, на найвышэйшым узроўні!

Акрамя таго, у гэты дзень адбылася дэманстрацыя дакументальнага фільма «Беларуская дыпламатыя. Першы міністр». Гэту 26-хвілінную стужку з элементамі чорна-белай хронікі зняў рэжысёр Сяргей Агеенка на студыі «Летапіс» у 2013 г. У ёй распавядаецца пра жыццёвы шлях хлопца з простай беларускай сялянскай сям'і, які падняўся да вышынь дзяржаўнай улады, лёсу прадстаўнічага дыпламатычнага дзеяча Беларусі і беларускай навукі міжнародных адносін. Адлюстраваны ў стужцы і ўдзел дэлегацыі Савецкай Беларусі ў канферэнцыі ў Сан-Франціска ў 1945 г... Менавіта тады Кузьма Кісялёў навучыў увесь свет правільна гаварыць і пісаць назву сваёй краіны. Яго подпіс стаіць пад устаноўчымі дакументамі ААН. З таго памятнага 1945 г. Беларусь з'яўляецца краінай-заснавальніцай і паўнапраўным членам Арганізацыі Аб'яднаных Нацый. На пасту міністра Кісялёў праслужыў больш за 20 гадоў, і жыццё яго было неаддзельнае ад гісторыі краіны.

Як вядома, шматлікія гістарычныя факты з гадамі пераходзяць у разрад легенд і міфаў. І, пэўна, такі якасны пераход з'яўляецца паказчыкам ступені ўнікальнасці падзей, феномену асобы. Першы міністр замежных спраў БССР Кузьма Венедыктавіч Кісялёў – з гэтага легендарнага шэрагу.

**ФАКТ 1**

«Беларуская дэлегацыя прыехала на ўстаноўчую канферэнцыю ў Сан-Франціска. Пайшлі глядзець залу пасяджэнняў. І нечакана для сябе там, дзе павінна была сядзець беларуская дэлегацыя, выявілі таблічку з надпісам «White Russia» – «Белая Расія». Глава дэлегацыі Кісялёў быў вельмі незадаволены тэкстам. Заявіў, што БССР не Белая Расія, што не трэба блытаць гэтыя два паняцці, і таблічку замянілі».

*Аляксандр ЦІХАМІРАЎ, загадчык аддзела ўсеагульнай гісторыі новага і найноўшага часу Інстытута гісторыі НАН Беларусі. З фільма «На карце свету. Фільм дзясяты».*

**ФАКТ 2**

«Ідзе Карэйская вайна. На адным з пасяджэнняў Генасамблеі слова ўзяў чайнканшыст і пачаў паліваць брудам СССР... Вышынскі даў указанне ігнараваць гэты выбрык. Але, калі карэец разышоўся і апусціўся, як кажуць, да вулічнай лаянкі, бацька не вытрымаў, устаў, пайшоў на трыбуну. Без падрыхтоўкі даў адпаведны адказ».

*З успамінаў Васіля КІСЯЛЁВА, сына К. Кісялёва.*

А зараз пра гэты ўчынак, які мог каштаваць жыцця міністру замежных спраў БССР Кісялёву, падрабязней. Андрэй Януар'евіч Вышынскі ў 1949–1953 гг., у разгар пачатковага этапу халоднай вайны і падчас вайны ў Карэі – міністр замежных спраў СССР. Як пішуць гісторыкі, ён быў вядомы сваім грубіянствам з падначаленымі і ўмеў наводзіць страх на навакольных. Аднак перад вышэйшым начальствам трымаўся ліслiва, дагодліва. Вышынскі, безумоўна, не прабачыў самастойнага ўчынку Кісялёву. Фактычна беларускі міністр быў пасаджаны пад хатні арышт... І там, у савецкай рэзідэнцыі, ён чакаў рашэння. Вядома, што на гэтай падставе накіравалі тэлеграму Сталіну... І толькі яго рашэнне выратавала Кузьму Венедыктавіча. Сталін на несанкцыянаваную прамову нашага дыпламата адказаў: «Нам патрэбныя такія экстрэмісты, як Кісялёў».

**ДАВЕДКА.**

Кісялёў Кузьма Венедыктавіч (01.11.1903 – 04.05.1977) нарадзіўся ў в. Лабковічы Магілёўскай вобласці. Скончыў медыцынскі факультэт Варонежскага дзяржаўнага ўніверсітэта па спецыяльнасці ўрач-неўрапатолаг, Інстытут чырвонай прафесуры ў Маскве. З 1937 па 1938 гг. – народны камісар аховы здароўя БССР, з 1938 па 1940 гг. старшыняваў у Савеце народных камісараў (СНК) БССР. З 1944 па 1958 гг. – першы намеснік старшыні СНК і наркам (з 1946 г. міністр) замежных спраў БССР. З 1958 па 1966 гг. – міністр замежных спраў БССР. Меў ранг Надзвычайнага і Паўнамоцнага Пасла. Быў дэпутатам Вярхоўнага Савета СССР і членам ЦК КПБ.

Узнагароджаны двума ордэнамі Леніна, двума ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга, ордэнам «Знак Пашаны» і медалямі. Аўтар успамінаў «Занатоўкі савецкага дыпламата».

Кузьма Кісялёў удзельнічаў у 20 сесіях ААН, больш як 350 канферэнцыях і саветах. Па яго ініцыятыве было адчынена пастаяннае прадстаўніцтва БССР пры ААН. Подпіс Кісялёва стаіць пад больш чым 80 міжнароднымі актамі па прававых і палітычных пытаннях. Усе свае выступленні пісаў асабіста. Кузьма Кісялёў – своеасаблівы рэкардсмен беларускай дыпламатыі: пасаду першага міністра замежных спраў БССР займаў 22 гады.

**Жанна ВАСАНСКАЯ**

КААПЕРАЦЫЯ

# Пра супрацоўніцтва БДУ і ГрДУ імя Я. Купалы

Сумесныя навуковыя даследаванні Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта і Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Я. Купалы выконваюцца ў адпаведнасці з зацверджаным палажэннем аб конкурсе сумесных грантаў і рашэннем рэктарата БДУ аб развіцці супрацоўніцтва БДУ з ГрДУ імя Я. Купалы (загад рэктара БДУ ад 21.05.2010).

У перыяд з 2010 па 2012 гады ў рамках супрацоўніцтва паміж БДУ і ГрДУ імя Я. Купалы было выканана 17 сумесных праектаў (2010 г. – 5, 2011 г. – 5, 2012 г. – 7).

Падчас выканання сумесных праектаў значна пашырылася геаграфія навуковых кантактаў паміж падраздзяленнямі ўніверсітэтаў. Атрыманыя вынікі адрозніваліся навізной у пастаноўцы і метадах правядзення даследаванняў, а таксама мелі навуковую і практычную значнасць.

У выніку сумесных даследаванняў падрыхтаваны і выдадзены ў 2012 г. зборнік «Эліза Ажэшка ў эстэтычнай прасторы славянскіх краін». Зборнік прысвечаны 170-годдзю з дня нараджэння вялікай гуманісткі, заступніцы простых людзей, вядомай пісьменніцы Элізы Ажэшкі.




Сёлета выконваецца 6 сумесных праектаў па прыярытэтных кірунках навукова-тэхнічнай дзейнасці і фундаментальных даследаванняў Рэспублікі Беларусь у галінах фізікі, матэматыкі, інфарматыкі, тэхнічных навук, хіміі і навук аб Зямлі, біялогіі, медыцыны, гуманітарных навук.

Плённае супрацоўніцтва БДУ і ГрДУ імя Я. Купалы служыць добрым прыкладам пашырэння навуковых сувязяў сталічных і рэгіянальных універсітэтаў, развіцця ўніверсітэцкай навукі ў рэгіёнах Беларусі. БДУ адкрыты для навуковай і навукова-тэхнічнай кааперацыі з усімі рэгіянальнымі ўніверсітэтамі.

**Паводле інфармацыі ГУН**

НАШЫ ЮБІЛЯРЫ

**3 лістапада Жаровіна Тамара Мікалаеўна,** дацэнт кафедры тэорыі функцый

**13 лістапада Воранава Ніна Уладзіміраўна,** дацэнт кафедры заалогіі

**14 лістапада Грынёў Васіль Віктаравіч,** дацэнт кафедры генетыкі

**20 лістапада Зубоўская Наталля Канстанцінаўна,** дацэнт кафедры нямецкай мовы

**22 лістапада Казей Ірына Міхайлаўна,** дацэнт кафедры грамадзянскага працэсу і працоўнага права

**22 лістапада Філіпцова Галіна Рыгораўна,** дацэнт кафедры клеткавай біялогіі і біяінжынерыі раслін

**22 лістапада Бурак Тацяна Віктараўна,** дацэнт кафедры сацыялогіі

**24 лістапада Ціханаў Сяргей Віктаравіч,** дацэнт кафедры вышэйшай алгебры і абароны інфармацыі

**25 лістапада Іода Андрэй Віктаравіч,** дырэктар рэспубліканскага навукова-даследчага ўнітарнага прадпрыемства «Цэнтр электроннага дакументазвароту» БДУ

**26 лістапада Радына Аляксандр Якаўлевіч,** дацэнт кафедры тэорыі функцый

**27 лістапада Ушакоў Дзмітрый Уладзіміравіч,** дацэнт кафедры фізікі і аэракасмічных тэхналогій

*Спіс усіх імянніннікаў размешчаны на сайце БДУ www.bsu.by у раздзеле «Нашы юбіляры».*

**Паводле інфармацыі ўпраўлення кадраў БДУ**

АБ'ЯВЫ

**БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ**

**АБ'ЯЎЛЯЕ КОНКУРС НА ЗАМЯШЧЭННЕ ПАСАД**

ЗАГАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: фізічнай геаграфіі свету і адукацыйных тэхналогій, агульнага землязнаўства і гідраметэаралогіі, геадэзіі і картаграфіі, фізіялогіі чалавека і жывёл, гісторыі журналістыкі, літаратурна-мастацкай крытыкі, перыядычнага друку, археалогіі і спецыяльных гістарычных дысцыплін, гісторыі Расіі, этналогіі, музеалогіі і гісторыі мастацтваў, тэарэтычнага і славянскага мовазнаўства, гісторыі беларускай літаратуры, рускай літаратуры;

ПРАФЕСАРАЎ КАФЕДРАЎ: функцыянальнага аналізу, агульнай экалогіі і методыкі выкладання біялогіі, тэарэтычнага і славянскага мовазнаўства;

ДАЦЭНТАЎ КАФЕДРАЎ: вышэйшай матэматыкі, інфармацыйных сістэм кіравання, матэматычнай фізікі, тэорыі імавернасцяў і матэматычнай статыстыкі, агульнага землязнаўства і гідраметэаралогіі, геадэзіі і картаграфіі, англійскай мовы прыродазнаўчых факультэтаў, тэорыі функцый, вышэйшай алгебры і абароны інфармацыі, функцыянальнага аналізу, мікрабіялогіі, перыядычнага друку, стылістыкі і літаратурнага рэдагавання, замежнай журналістыкі і літаратуры, гісторыі Расіі, гісторыі Беларусі старажытнага часу і сярэдніх вякоў, крыніцазнаўства, этналогіі, музеалогіі і гісторыі мастацтваў, гісторыі новага і найноўшага часу, прыкладной лінгвістыкі, рыторыкі і методыкі выкладання мовы і літаратуры, рускай мовы, рускай літаратуры, сучаснай беларускай мовы;

СТАРШЫХ ВЫКЛАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: шматпрацэсарных сістэм і сетак, фізічнай геаграфіі свету і адукацыйных тэхналогій, англійскай мовы прыродазнаўчых факультэтаў, тэорыі функцый, сістэмнага аналізу і камп'ютарнага мадэлявання, фізічнага выхавання і спорту, тэлебачання і радыёвяшчання, перыядычнага друку, крыніцазнаўства, раманскага мовазнаўства, класічнай філалогіі;

ВЫКЛАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: глебазнаўства і зямельных інфармацыйных сістэм, раманскага мовазнаўства, нямецкага мовазнаўства, класічнай філалогіі;

АСІСТЭНТА КАФЕДРЫ тэхналогій праграмавання.

*Тэрмін конкурсу – 1 месяц з дня апублікавання аб'явы.*
*Адрас: 220030, г. Мінск, вул. Бабруйская, 5а,*
*упраўленне кадраў, тэл. 209-54-36.*

**НАВУКОВА-ДАСЛЕДЧАЯ УСТАНОВА «ІНСТЫТУТ ПРЫКЛАДНЫХ ФІЗІЧНЫХ ПРАБЛЕМ ІМЯ А. Н. СЕЎЧАНКІ» БДУ**

**АБ'ЯЎЛЯЕ КОНКУРС НА ЗАМЯШЧЭННЕ ПАСАДЫ**

НАВУКОВАГА СУПРАЦОЎНІКА па спецыяльнасці 01.04.01 (прыборы і метады эксперыментальнай фізікі) – 1.

*Тэрмін конкурсу – 1 месяц з дня апублікавання аб'явы.*
*Дакументы накіроўваць на адрас: 220045, г. Мінск, вул. Курчатава, 7.*
*Тэлефон 212-48-43.*

**УСТАНОВА БДУ «НАВУКОВА-ДАСЛЕДЧЫ ІНСТЫТУТ ПРЫКЛАДНЫХ ПРАБЛЕМ МАТЭМАТЫКІ І ІНФАРМАТЫКІ»**

**АБ'ЯЎЛЯЕ КОНКУРС НА ЗАМЯШЧЭННЕ ПАСАДЫ**

СТАРШАГА НАВУКОВАГА СУПРАЦОЎНІКА навукова-даследчай лабараторыі матэматычных метадаў абароны інфармацыі.

*Тэрмін конкурсу – 1 месяц з дня апублікавання аб'явы.*
*Адрас: 220030, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 4, п. 702, НДІ прыкладных праблем матэматыкі і інфарматыкі, тэл. 209-51-04.*

# БДУ Ў СМІ БЕЛАРУСІ

**Пра правядзенне ў БДУ канферэнцыі ААН «Выкарыстанне касмічных тэхналогій для сацыяльна-эканамічнага развіцця краін»** – sb.by (15.10), БелТА, radiobelarus.tvr.by, press.net.by, kv.by (18.10), interfax.by (19.10), kp.by, naviny.by, 21.by, БелаПАН (20.10), tut.by (21.10), gis.rkomi.ru, souzveche.ru, post-komsg.com (22.10).

**Рэпетыцыйнае тэсціраванне ў БДУ** – БелаПАН (13.10), naviny.by, bdg.by, 21.by, open.by, mogilev.by (14.10), interfax.by (15.10), tut.by (16.10), «Мінск-24 ДОК» (17.10), «Звязда», zviazda.by (24.10), «Мінскі кур'ер» (30.10).

**Выступленне з лекцыяй навуковага супрацоўніка Еўрапейскай арганізацыі па ядзерных даследаваннях (CERN) доктара Паўля Лекока ў БДУ** – БелаПАН, 1 нац. канал Бел. радыё, БТ-1, «Мінск-24 ДОК» (16.10).

**Каманда «Зорка-БДУ» стала бронзавым прызёрам чэмпіянату Беларусі па жаночым футболе** – tut.by (20.10), БелТА, news.uvaga.by (22.10).

**Пра міжнародную канферэнцыю «Славянскія літаратуры ў кантэксце сусветнай», арганізаваную філалагічным факультэтам БДУ** – БелаПАН, naviny.by (21.10), mail.ru (22.10), ctv.by (24.10), molodechno.edu.minskregion.by (25.10).

**Святкаванне 92-годдзя БДУ** – БелТА, eurobelarus.by (26.10), ctv.by, wuz.by, 1 нац. канал Бел. радыё (30.10).

**У БДУ распачата рэалізацыя новага праекта «Актуальныя праблемы развіцця навукі, адукацыі, культуры»** – БелТА, minsknews.by, zn.by (30.10), радыё «Сталіца» (31.10), med.by (01.11).

**Пра ўдзел каманды БДУ ў Міжнароднай баскетбольнай студэнцкай лізе** – minsknews.by (31.10), sporta-klubi.lv (01.11), press.net.by, mail.ru (08.10), БТ-1, news.sport-express.ru (09.11), isbl-basket.com (10.11).

**Інжынер-геафізік Нацыянальнага навукова-даследчага цэнтра маніторынгу азонасферы БДУ Ілья Бручкоўскі ўвайшоў у склад VI беларускай антарктычнай экспедыцыі** – БелТА (04.11), bdg.by, ng.by, 21.by (05.11).

**Прэзентацыя кнігі «Мінскі міжнародны кінафестываль «Лістапад»: праз 20 гадоў» загадчыцы кафедры літаратурна-мастацкай крытыкі Інстытута журналістыкі БДУ дацэнта Людмілы Саянковай** – БелТА, 21.by, БелаПАН, naviny.by, listapad.by (05.11).

**Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ**

СПАРТПЛЯЦОЎКА

# ДАЦЯГНУЦЦА ДА ЗОРАК

**Баскетбольная каманда БДУ заняла 3 месца** ў першым туры дывізіёна «Прыбалтыка» Міжнароднай студэнцкай баскетбольнай лігі (МСБЛ). Спаборніцтвы завяршыліся 10 лістапада ў Мінску.


*Трэнер каманды БДУ Дзмітрый Навіцкі тлумачыць гульцам, як дасягнуць поспеху*

Перамогу на беларускім полі атрымалі студэнты Латвійскага дзяржаўнага ўніверсітэта, якія набралі 6 балаў. На другім месцы – Вышэйшая школа бізнесу «Turiba» з 5 баламі. Каманда БДУ набрала 4, а гродзенцы – тры балы. Балы налічаліся ў адпаведнасці з прынцыпам: два за перамогу ў гульні і адзін за паражэнне.

Нашы хлопцы, на жаль, саступілі абедзвюм латвійскім камандам, але выйгралі ў Гродна з лікам 74:66. Адзначым, што самым дзейсным гульцом каманды БДУ прызнаны пяцікурснік фізічнага факультэта Яраслаў Курапаў. Дарэчы, згодна з палажэннем МСБЛ, удзельнікамі каманд могуць быць студэнты дзённай формы навучання, плюс дапускаюцца два спартсмены збоку. Наша каманда складалася выключна са студэнтаў ІБМТ, ДІКСТ, мехмата, юрфака, ФПМІ, ФРКТ, фізфака, эканамфака і геафака. Трэніруюць каманду былыя прафесійныя баскетбалісты Дзмітрый Навіцкі і Анатоль Парфіяновіч.

Нагадаем, што каманды БДУ і ГрДУ імя Янкі Купалы з'яўляюцца дэбютантамі спаборніцтваў, якія праводзяцца другі год. Таму, відавочна, нашым не хапіла досведу выступленняў на такім сур'ёзным узроўні.

Зрэшты, у каманды БДУ ёсць яшчэ рэальны шанец адыграцца. 8 снежня нашы хлопцы сустрэнуцца ў другім туры дывізіёна «Прыбалтыка» МСБЛ са сваімі суайчыннікамі з Гродна на іх пляцоўцы. А 13 і 14 снежня баскетбалісты БДУ і ГрДУ імя Я. Купалы выступяць у Рызе.

У чэмпіянаце МСБЛ сезона 2013–2014 гг. прымаюць удзел 39 універсітэцкіх каманд з 12 краін: Беларусі, Грузіі, Англіі, Харватыі, Славеніі, Сербіі, Расіі, Эстоніі, Латвіі, Украіны, Кітая і Казахстана. Па выніках сезона найлепшая каманда МСБЛ атрымае пуцёўку на прысутнасць у Мілане (Італія) на фінальным матчы Еўралігі.

**ДАВЕДКА.**

Міжнародная студэнцкая баскетбольная ліга з'яўляецца ўнікальным аб'яднаннем найлепшых універсітэцкіх каманд Еўразіі. Створаная ў верасні 2012 г. Яе старшынёй з'яўляецца намеснік главы ўрада РФ Аркадзь Дварковіч, а ў складзе апякунскага савета: Аляксандр Канавалаў (міністр юстыцыі РФ), Аляксандр Новак (міністр энергетыкі РФ), Дзмітрый Ліванаў (міністр адукацыі і навукі РФ), Павел Калабкоў (намеснік міністра спорту РФ), Васіль Цітоў (першы намеснік та – старшыні праўлення Банка ВТБ), Юрый Бякаў (член савета дырэктараў групы «Астэрас»), Сяргей Тараканаў (заслужаны майстар спорту, алімпійскі чэмпіён).

**Эзіз АВЕЗАЎ**

СУПРАЦОЎНІЦТВА

# ЭЙНДХОВЕН – МІНСК: СУМЕСНАЯ ВУЧОБА – СУМЕСНЫ БІЗНЕС

З 30 кастрычніка па 2 лістапада на эканамічным факультэце прайшоў сумесны семінар эканамічнага факультэта БДУ і Інстытута маркетынгу і менеджменту Фонтыс (Нідэрланды) на тэму **«Узаемадзеянне ўніверсітэтаў, муніцыпалітэтаў і бізнесу».**


*Злева направа: Ян Эвард Янсен, Вольга Лаўрова, Кацярына Гаспадарык, Хендрык Ян Бруіль, Пітэр ван дэр Шыі, Крысціна Шастакова, Міхаіл Кавалёў (дэкан), Аляксандр Цярашкоў.*

Рэч у тым, што партнёр БДУ інстытут Фонтыс размешчаны ў горадзе-пабраціме Мінска Эйндховене. На семінары аналізаваліся поспехі 10-гадовага супрацоўніцтва, якія ўключалі выкананне сумесных бізнес-праектаў у галіне лагістыкі, мадэрнізацыі беларускага машынабудавання, стажыроўкі выкладчыкаў і студэнтаў на прадпрыемствах Мінска і ў Парках высокіх тэхналогій Эйндховена.

Калегі з Фонтыс праслухалі англамоўныя лекцыі беларускіх калегаў па эканаметрыцы, бізнес-інфарматыцы, макраэканоміцы і адзначылі іх высокі ўзровень, уменне камунікаваць са студэнтамі, дапытлівасць беларускіх студэнтаў. Галандскія прафесары прачыталі лекцыі «Структура дзелавога пісьма» і «Фінансавыя і дэрыватыўныя інструменты».

Падпісана новая дамова аб супрацоўніцтве на наступныя 5 гадоў.

**Інтэрнацыяналізацыя**

На эканамічным факультэце, дзякуючы стварэнню трох новых кафедраў і адкрыццю дзевяці практыка-арыентаваных магістратур, колькасць замежных магістрантаў дасягнула 116 чалавек. Сярод іх грамадзяне КНР, РФ, Лівіі, Туркменістана, Азербайджана, Нігерыі, Сірыі, Казахстана. Кожны другі магістрант на факультэце – замежнік. Магістарская падрыхтоўка працягвае паспяховую працу замежных студэнтаў на першай ступені, на якой сёння навучаецца больш за 360 замежных студэнтаў з 16 краін свету. Факультэт па ступені інтэрнацыяналізацыі навучання, а гэта найважнейшы паказчык міжнародных рэйтынгаў, стаў параўнальны з найлепшымі замежнымі эканамічнымі факультэтамі.

**Ірына КАРАЧУН,**
**намеснік дэкана**
**эканамічнага факультэта**

ДАСЯГНЕННІ

Аспірантка хімічнага факультэта БДУ Юлія Бокшыц удастоена дыплома лаўрэата конкурсу Вышэйшай атэстацыйнай камісіі (ВАК) РБ **«Найлепшая дысертацыя 2012 года».**



Яе даследчая праца «Фарміраванне біметалічных наначасціц металаў падгрупы медзі ў водных растворах і аксідных плёнках» прызнана найлепшай у намінацыі «Прыродазнаўчыя навукі».

Адзначым, што зараз Юлія Бокшыц з'яўляецца навуковым супрацоўнікам лабараторыі нанахіміі НДІ ФХП БДУ.

КОНКУРСЫ




**Штогадовы каляндар БДУ на 2014** год будзе выкананы па дызайне чацвёртакурсніцы гуманітарнага факультэта БДУ Анастасіі МАЗГАВОЙ.

Яе малюнак перамог у конкурсе на найлепшую фатаграфію, малюнак, калаж «Мой універсітэт», які праводзіўся з мэтай пошуку варыянтаў афармлення каляндара БДУ.

Праца Анастасіі Мазгавой упрыгожыць самы зручны і інфарматыўны выгляд каляндара – «Домік». Ён складаецца з 3 бакоў, адзін з якіх выкарыстоўваюць як аснову, два іншыя выкарыстоўваюць для нанясення календарнай сеткі паўгоддзяў.

Яшчэ адзін выгляд календара ВНУ на наступны год – «Нататнік» – па-мастацку аформіць таксама студэнтка 4 курса гуманітарнага факультэта *Ганна Трусевіч*. Акрамя таго, дызайнерскі праект яе сакурсніка *Данііла Верамейчыка* будзе скарыстаны пры распрацоўцы каляндара БДУ на 2015 год.

Адзначым, што ў творчым спаборніцтве ўсяго было прадстаўлена 20 студэнцкіх прац. Конкурс на найлепшую фатаграфію, малюнак, калаж «Мой універсітэт» праводзіцца ў БДУ ўпершыню, і яго арганізатарам выступіў выдавецкі цэнтр БДУ.

**Паводле інфармацыі УВРМ**

ДА ЎВАГІ!

# ПРАФІЛАКТЫКА ЦЕПЛАТРАЎМАТЫЗМУ

З мэтай папярэджання цеплатраўматызму Дзяржэнерганадзор звяртае ўвагу на неабходнасць строга прытрымлівацца правілаў тэхнічнай эксплуатацыі цеплаўстановак і цеплавых сетак спажыўцоў, інструкцый па ахове працы і тэхніцы бяспекі і іншых нарматыўных дакументаў.

У структурных падраздзяленнях БДУ службай галоўнага механіка сумесна з прадстаўнікамі філіяла «Энерганагляд» РУП «Мінскэнерга» распрацаваны комплекс мерапрыемстваў, якія ўключаюць пытанні па бяспечных метадах працы, атэстацыі і навучанні эксплуатацыйнага і апаратыўна-рамонтнага персаналу, належнай эксплуатацыі і своечасовым правядзенні рамонтных і рамонтна-прафілактычных прац, укараненні нараднай сістэмы.

Забяспечваецца кантроль адпаведнасці абсталявання патрабаванням бяспекі, прытрымлівання персаналам правілаў аховы працы, ужывання засцерагальных прыстасаванняў, адмысловага абутку і сродкаў індывідуальнай абароны.

Неабходна памятаць пра магчымыя рызыкі траўматызму, праяўляць асаблівую абачлівасць і асцярожнасць.

Зважайце на пашкоджанні вонкавых цеплавых сетак, у тым ліку ўцечкі сеткавай вады, інтэнсіўныя выпарэнні, правалы грунту, адсутнасць вечкаў люкаў цеплавых камер.

Неадкладна паведамляйце пра гэта ў службу галоўнага механіка, аварыйна-тэхнічную службу БДУ і энергазабяспечвальныя арганізацыі.

**Начальнік РІ-2 ММРА па наглядзе за цеплаўстаноўкамі філіяла «Энерганагляд» РУП «Мінскэнерга»**
**С. У. СТАСЕНКА**
**Служба гал. механіка ГГУ БДУ**

УНІВЕРСІТЭТ
Выдаецца з 1929 года

Заснавальнік газеты – Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт
Газета ўзнагароджана Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР

Выданне зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 1082 ад 21 студзеня 2010 года

15 лістапада 2013 года
Падпісана да друку 13.11.2013 г.
Зак. 697. Тыраж 1500 экз.
Надрукавана ў РУП «Выдавецкі цэнтр БДУ»
ЛП № 02330/0494178 ад 03.04.2009.
220030, г. Мінск, вул. Чырвонаармейская, 6

**Рэдактар Сяргей Сяргеевіч ШАФАЛОВІЧ**
Карэктар Ганна РАК
Адрас рэдакцыі: 220030, Мінск, прасп. Незалежнасці, 4
Прыёмная: вул. Кальварыйская, 9, каб. 102, тэл. 259-70-77,
*e-mail: gazeta@bsu.by; www.gazeta.bsu.by*